УДК 82.09

**Чарнавокая Аляксандра Міхайлаўна**
Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы,
Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі
(г. Мінск, Беларусь)
lecsa87@gmail.com

# ДАСЛЕДАВАННЕ ПРАБЛЕМ ГІСТОРЫІ І ТЭОРЫІ ЛІТАРАТУРЫ Ў РАБОТАХ АЛЕСЯ СЯМЁНАВІЧА ЯСКЕВІЧА

Артыкул прысвечаны дзейнасці доктара філалагічных навук А.С. Яскевіча (нар. у 1934 г.). Разглядаюцца яго асноўныя працы, прысвечаныя праблемам рытму, мастацкага вобраза, псіхалогіі творчасці. А. Яскевіч паўстае даследчыкам, які меў прагрэсіўныя погляды, не абмінаў праблемы савецкай літаратуры, шмат увагі прысвячаў маладым пісьменнікам, з глыбокай цікавасцю ставіўся да дасягненняў гуманітарных навук.

***Ключавыя словы:*** А. Яскевіч, гісторыя беларускага літаратуразнаўства, мастацкая проза, вобраз, рытм, ідэалогія



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

The article is devoted to the activity of doctor of philological science A. Yaskevich (born in 1934). His main works deal with the problems of rhythm, image, psychology of creativity. A. Yaskevich is a researcher with progressive views, he drew attention to the problems of Soviet literature, analyzed young writers' works, was deeply interested in the achievements of the Humanities.
***Keywords:*** A. Yaskevich, history of Belarusian literary criticism, fiction, image, rhythm, ideology

У другой палове XX ст у беларускім літаратуразнаўстве плённа працавалі такія выбітныя даследчыкі, як Алесь Адамовіч, Міхась Мушынскі, Дзмітрый Бугаёў, Іван Навуменка, Віктар Каваленка, Генадзь Кісялёў, Мікола Арочка… Адметнай асобай сярод навукоўцаў быў і Алесь Яскевіч, нараджэнец Магілёўшчыны. Працы Алеся Сямёнавіча заўсёды былі важнай рэплікай у літаратурным дыялогу, шырока абмяркоўваліся на старонках манаграфій і перыядычных выданняў. Пасля заканчэння аспірантуры ў 1964 г А. Яскевіч працаваў у Інстытуце літаратуры імя Я. Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, у 1992 г атрымаў ступень доктара філалагічных навук. Гэты артыкул – кароткі агляд навуковых здабыткаў А. Яскевіча, прымеркаваны да 85-годдзя з дня нараджэння даследчыка.

А. Яскевіч нарадзіўся 12 чэрвеня 1934 г у вёсцы Ушакі Чэрыкаўскага раёна. У 1953 г. скончыў з сярэбраным медалём Слаўгарадскую сярэднюю школу. У адрозненне ад большасці сваіх калег А. Яскевіч атрымаў вышэйшую адукацыю на аддзяленні журналістыкі БДУ, таму многім яго даследаванням уласцівая дыскусійнасць, вастрыня, праблемная скіраванасць. Як адзначаў Д. Бугаёў, у асобе А. Яскевіча «спалучаюцца эрудзіраваны гісторык літаратуры і тонкі, чулы да мастацкага слова, праніклівы крытык» [1, с. 3].

Першыя кнігі А. Яскевіча – зборнікі літаратурна-крытычных артыкулаў «Карані маладога дрэва» (1967) і «Ад слова да вобраза» (1968).

Першая кніга была прысвечана як асаблівасцям развіцця нацыянальнай літаратуры, так і актуальным літаратурным праблемам. У артыкулах «Пачатак» і «Пошукі стылю» прадстаўлены традыцыйны на той час погляд на гісторыю нашай літаратуры, паводле якога беларускія пісьменнікі «фарміраваліся як аўтары на народнай моўнай стыхіі, на фальклоры, і першае слова іх кніжнай творчасці было як бы апошнім словам, апошнім дасягненнем творчасці народнай» [2, с. 7]. Тэма фальклорнага ўплыву на станаўленне беларускай літаратуры была нязменна актуальнай для А. Яскевіча і стасавалася з яго вялікай прыхільнасцю да канцэпцыі эвалюцыйнага развіцця літаратуры.

Артыкул «Пошукі стылю» быў адной з першых публікацый другой паловы XX ст., дзе сцвярджалася «вялікая, неаспрэчная роля літаратурна-мастацкага згуртавання "Узвышша" ў развіцці нашай літаратуры» [2, с. 45]. А. Яскевіч з надзвычайнай павагай пісаў пра літаратурна-крытычную дзейнасць А. Бабарэкі, творчасць У Дубоўкі і іншых сяброў літаб'яднання. Даследчык падкрэсліваў неабходнасць выдання збору твораў А. Бабарэкі для «карысці нашай літаратурнай справы» [1, с. 49] – што ажыццявілася амаль праз паўстагоддзя.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Асобныя артыкулы прысвечаны лірычнай прозе, знаходкам маладых пісьменнікаў у галіне сюжэтыкі і кампазіцыі. Сярод праблем тагачаснай літаратуры А. Яскевіч акцэнтаваў «нізкі узровень культуры сучаснага мыслення, неглыбокі роздум і асэнсаванне фактаў і з'яў рэчаіснасці, адсутнасць вялікіх думак аб нашых днях» [2, с. 112], – і заахвочваў творцаў удасканальваць стыль і паглыбляць свой погляд на свет [2, с. 115].

У кнізе «Ад слова да вобраза» літаратура цікавіла даследчыка найперш як мастацтва вобразнае – адпаведна, А. Яскевіч разважаў пра развіццё мовы, фарміраванне вобразнага мыслення, звяртаўся да гісторыі розных відаў мастацтва, арыентаваўся на навуковыя працы па філасофіі, псіхалогіі, культуралогіі. А. Яскевіч таксама даследаваў сюжэтабудову, звяртаў увагу на важнасць рытму ў прозе і вялікую значнасць мастацкай дэталі.

Першыя кнігі даследчыка сведчылі пра добрую абазнанасць у гісторыі і тэорыі літаратуры, здольнасць удумліва і аб'ектыўна аналізаваць мастацкія тэксты. Пры гэтым А. Яскевічу важна было звярнуць увагу на моманты, важныя ў канкрэтнай літаратурнай сітуацыі, вылучыць аспекты, актуальныя тут і цяпер: падказаць творцам, на што варта звярнуць увагу і ад чаго ўхіліцца, удакладніць пэўныя ацэнкі, паспрыяць пераадольванню стэрэатыпаў і пашырэнню прагрэсіўных поглядаў, узгадаць прызабытыя імёны, вылучыць цікавыя, але маладаследаваныя тэмы, падкрэсліць значэнне творчасці сучаснікаў. А. Яскевіч свабодна выказваў уласныя меркаванні, што выклікала шчыры водгук з боку чытачоў: у друку з'явіліся прыхільныя і непрадузятыя рэцэнзіі Д. Бугаёва, А. Марціновіча, К. Хромчанкі, У Юрэвіча. На недахопы асобных артыкулаў А. Яскевіча звяртаў увагу Д. Бугаёў [1] – гэтыя слушныя заўвагі былі карысныя для аўтара і яго маладых калег.

У 1972 г. выйшла з друку калектыўная манаграфія «Шляхі развіцця беларускай савецкай прозы», дзе А. Яскевіч быў аўтарам раздзела, прысвечанага прозе 1945–1970 гг. Даследчык высока ацэньваў творы І. Мележа, В. Быкава, Я. Брыля, І. Шамякіна, А. Кулакоўскага, М. Стральцова, звяртаў увагу на поспехі маладых літаратараў. У якасці праблем, з якімі можа сутыкнуцца пісьменнік, ён называў адсутнасць уласнай тэмы, нястачу душэўнай энергіі, грамадзянскай і жыццёвай смеласці. А. Яскевіч крытычна ставіўся да тагачаснай культурнай сітуацыі і неаднойчы падкрэсліваў, што аўтары, якія павінны «несці сучасніку свае назіранні, сумненні, запытанні, узнімаць складаныя канфлікты, што былі ў жыцці, выяўляць усё нездаровае, адмоўнае, што замінала руху наперад, часам залішне захапляліся гучным пафасам, станавіліся на шлях бесканфліктнага паказу жыцця» [3, с. 194].

Ацэначнасць, палемічная завостранасць, актыўнае імкненне аўтара паўплываць на літаратурную сітуацыю даюць падставу заўважыць, што раздзел напісаны хутчэй у стылі часопіснага агляду, чым літаратуразнаўчага артыкула. Дарэчы, А. Яскевіч неаднойчы абгрунтоўваў уласнае бачанне задач літаратуразнаўчага даследавання: «У ідэале працэс развіцця літаратурнай



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

тэорыі ўяўляецца наступным чынам. Усё больш уздымаючыся па меры сваёй сталасці на ступені надзвычай высокіх узроўняў абстрагавання і абагульнення, якія б адпавядалі сучаснаму этапу пазнання, яна прытым мусіць імкнуцца захаваць статус жывых ведаў, у чымсьці нават змыкацца па заглыбленасці і тонкасці сваіх вывадаў з культурай творчасці … І для літаратурнай навукі не можа быць горшага прысуду, чым яе бясплённая затэарэтызаванасць, непрыдатнасць для жывой літаратурнай справы» [4, с. 203].

Відавочна, А. Яскевіч быў не схільны працаваць выключна ў межах літаратуразнаўчых жанраў. У яго бібліяграфіі налічваецца яшчэ тры зборнікі – «Грані майстэрства» (1974), «Выхад за круг» (1985) і «Сумежжа» (1994), – дзе ў жанрах крытычных і літаратуразнаўчых артыкулаў распрацоўваюцца тэмы, якія стала цікавілі даследчыка: псіхалогія творчасці, сакрэты перакладу, станаўленне беларускай літаратуры ў пачатку ХХ ст., магчымасці інтэрдысцыплінарных даследаванняў, перспектывы развіцця філалагічнай навукі.

Літаратурна-крытычныя артыкулы А. Яскевіча спрыялі павелічэнню цікавасці да новых аўтараў, да творчасці беларускіх пісьменнікаў першай паловы ХХ ст, да літаратуразнаўчых праблем тэарэтычнага і практычнага характару. Але галоўны здабытак А. Яскевіча – навуковыя працы, сярод якіх найбольшую цікавасць маюць раздзел «Аспекты вобразнай структуры» з калектыўнай манаграфіі «Пытанні паэтыкі» (1974), аўтарскія манаграфіі «У свеце мастацкага твора» (1977) і «Рытмічная арганізацыя мастацкага тэксту» (1991).

У даследаванні «Аспекты вобразнай структуры» А. Яскевіч меў на мэце сцвердзіць нязменную значнасць мастацкай літаратуры – у супрацьвагу дакументальнай літаратуры, якая рабілася ўсё больш запатрабаванай. На думку А. Яскевіча, вартасць мастацкай літаратуры вызначаецца ў першую чаргу «фенаменальнымі выяўленчымі магчымасцямі мастацкага вобраза» [5, с. 83] – якія і сталі прадметам даследавання ў рабоце.

Даследчык ставіў пад сумнеў стэрэатыпны погляд на мастацкую літаратуру як «вобразна-малюнкавы жывапіс толькі сродкамі моўнай палітры» [5, с. 90] і апеляваў да больш сучаснага погляду на мастацкі вобраз, прапанаванага псіхалінгвістыкай: выяўленчая сутнасць мастацтва бачыцца «перш за ўсё ў слове, у новым, больш тонкім і ўважлівым падыходзе да яго, ва ўліку яго складанейшага ўнутранага свету, ва ўліку яго маторных, эматыўных, акустычных магчымасцей, урэшце, ва ўліку сілы, энергіі, зараджальнасці слова» [5, с. 94]. А. Яскевіч аналізаваў мастацкі вобраз у трох планах: малюнкава-прадметным, рытмічным і слоўна-экспрэсіўным і, такім чынам, надаваў вялікае значэнне выяўленча-экспрэсіўным магчымасцям мовы, гукавому ладу мастацкіх твораў – у прыватнасці, рытму, інтанацыйна-метрычнай будове прозы. Для беларускага літаратуразнаўства 1970-х гадоў гэта было смелым крокам і ў пэўным сэнсе пашырэннем эстэтычнай парадыгмы, таму даследаванне «Аспекты вобразнай структуры» – адно з самых цікавых у спадчыне А. Яскевіча. У гэтай працы шмат новых на той час ідэй, бо даследчык быў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

надзвычай абазнаны ў расійскім літаратуразнаўстве і ўводзіў у беларускі кантэкст новыя працы Ю. Лотмана, Б. Успенскага, А. Чычэрына, М. Арнаўдава, Е. Эткінда.

У манаграфіі «У свеце мастацкага твора» А. Яскевіч ставіў мэту разгледзець мастацкую творчасць на ўзроўні агульнай прыроды (складванне літаратуры як родавага феномена), на ўзроўні псіхалогіі творчасці (працэсы трансфармацыі жыццёвага матэрыялу ў мастацкую рэальнасць твора), а таксама на ўзроўні структуры [6, с. 20]. Аб'ектам даследавання былі творы І. Мележа, В. Быкава, М. Стральцова, І. Шамякіна, Я. Скрыгана, А. Кудраўца. Грунтоўная рэцэнзія на кнігу, напісаная Ю. Канэ, змешчана ў часопісе «Полымя» [7].

З 1960-х гадоў А. Яскевіча цікавіла праблема рытму мастацкай прозы. Напрыканцы 1980-х гг. гэту тэму можна было распрацоўваць не толькі на тэарэтычным, але і на практычным узроўні. Тэхнічныя магчымасці ўжо дазвалялі праверыць гіпотэзы вучоных – і А. Яскевіч з захапленнем узяўся за працу. Так і з'явілася манаграфія «Рытмічная арганізацыя мастацкага тэксту» [8].

У гэтай кнізе даследчык шмат разважаў над таямніцамі вершаванага рытму – але найбольш цікавымі падаюцца раздзелы, прысвечаныя прозе. А. Яскевіч адштурхоўваўся ад поглядаў А. Вастокава, які сцвярджаў ідэю складовай пэўнасці «прасадычнага перыяду» – колана, і меркаваў, што «працягласць прасадычнага перыяду вымяраецца 7-8 складамі» [8, с. 46]. Гэта гіпотэза не атрымала пацверджання на матэрыяле беларускай прозы – затое праз аналіз інтанаграм, выкарыстанне эксперыментальнай фаналагічнай тэхнікі А. Яскевіч зрабіў выснову, што «склады ў межах коланаў звязаны суадносінамі, якія з'яўляюцца нічым іншым, як суадносінамі гарманічнага шэрагу або самым відавочным набліжэннем да яго» [8, с. 58]. Далей даследчык ставіў складаную праблему – якім чынам рытм суадносіцца з сінтаксісам, з актуальным чляненнем сказа – і вырашаў яе, суадносячы свае назіранні з меркаваннямі В. Усеваладскага-Гернгроса, А. Пацебні, Б. Асаф'ева, І. Каўтуновай і іншых даследчыкаў. А. Яскевіч разглядаў асаблівасці мастацкай літаратуры на матэрыяле лірычнай і рытмізаванай прозы, надаючы таксама вялікую ўвагу творам Я. Коласа і Ф. Багушэвіча.

Канцэпцыі расійскіх літаратуразнаўцаў былі сур'ёзным падмуркам даследаванняў А. Яскевіча, прычым з першых кніг ён арыентаваўся на погляды фармалістаў кола ОПОЯЗа: Ю. Тынянава, Б. Эйхенбаума, В. Жырмунскага, В. Тамашэўскага. Глыбокая навуковая зацікаўленасць прыводзіла яго да прац шматлікіх замежных даследчыкаў (Т. Майер, Л. Леві-Бруль, М. Грамон, Й. Зульцэр, Ф. Заран і інш.). Безумоўна, А. Яскевіч быў таксама добра абазнаны ў творах еўрапейскіх аўтараў, «легалізаваных» у савецкай культуры – ад Арыстоцеля да А. Маруа і С. Моэма.

З іншага боку, у А. Яскевіча не атрымлівалася абмінаць маячкі, расстаўленыя ў той час савецкімі ідэолагамі, – таму даследчыку даводзілася



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

абгрунтоўваць значнасць сацыялістычнага рэалізму, асуджаць «амерыканскую эпідэмію антымастацтва» [5, с. 80], сцвярджаць што творы, напісаныя ў рэчышчы мадэрнізму маюць часта «банальную ідэю» і хварэюць на штучнасць формы [6, с. 154], а аўтары, якія пішуць у рэчышчы «плыні свядомасці» рызыкуюць выйсці «на голую фізіялогію, калі не паталогію» [6, с. 202]. Але ў крытыцы заходняй літаратуры А. Яскевіч быў надзвычай стрыманы, прычым некаторыя яго меркаванні маюць рацыянальнае зерне (гл., напрыклад, [6, с. 190; 205]).

Напрыканцы 1990-х гг. А. Яскевіч зацікавіўся праблемамі біблеістыкі і хрысціянскай літаратуры. Пабачылі свет яго кнігі «Біблейскі пераклад. Аб духоўнай паэзіі» (1998), «Біблія: пераклады, мова» (1999), «Прырода ў свеце Бібліі» (2003) і інш. У гэтых кнігах А. Яскевіч пісаў пра вызначальную ролю рэлігіі ў развіцці сусветнай культуры, пра розныя падыходы да перакладу Бібліі, пра кнігі Бібліі, якія з'яўляюцца помнікам беларускага пісьменства, пра практыку беларускамоўных перакладаў Свстога Пісання, а таксама звяртаўся да разгляду духоўнай паэзіі – твораў Г. Тварановіч-Сеўрук і Е. Кузьміной-Краваевай.

Як адзначаў М. Мушынскі, «А. Яскевіч паказаў сябе даследчыкам, якому ўласціва свежасць погляду на прыгожае пісьменства, тонкае адчуванне яго спецыфікі, імкненне спазнаць сакрэты і таямніцы творчага працэсу, схільнасць да шырокіх супастаўленняў і аналогій, уменне ўвесці творы беларускіх пісьменнікаў у агульналітаратурны кантэкст і вызначыць тое адметнае, новае, што яны ўнасілі ў агульналітаратурную скарбонку» [9, с. 79]. Алесь Яскевіч – даследчык, які меў прагрэсіўныя погляды, не абмінаў праблемы савецкай літаратуры, шмат увагі прысвячаў пісьменнікам свайго пакалення, а таксама маладзейшым аўтарам. Ён з глыбокай цікавасцю ставіўся да дасягненняў як літаратуразнаўства, так і іншых гуманітарных навук, і яго даследаванні ў галіне мастацкай вобразнасці і рытмічнай арганізацыі мастацкага тэксту не губляюць сваёй актуальнасці.

## Літаратура


1. Бугаёў, Д. Талент крытыка / Д. Бугаёў // Літаратура і мастацтва. – 1968. – 23 ліпеня. – С. 3.

2. Яскевіч, А. Карані маладога дрэва : літаратурна-крытычныя артыкулы / А. Яскевіч. – Мінск : Беларусь, 1967. – 203 с.

3. Яскевіч, А. На шляху росту і сталасці / А. Яскевіч // Шляхі развіцця беларускай савецкай прозы / В. Каваленка, М. Мушынскі, А. Яскевіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972. – С. 188–262.

4. Яскевіч, А. Выхад за круг : літаратуразнаўчыя артыкулы / А. Яскевіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1985. – 247 с.

5. Яскевіч, А. Аспекты вобразнай структуры / А. Яскевіч // Пытанні паэтыкі / В. Жураўлёў, І. Шпакоўскі, А. Яскевіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1974. – С. 80–163.

6. Яскевіч, А. У свеце мастацкага твора / А. Яскевіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1977. – 205 с.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

7. Канэ, Ю. Як гэта робіцца / Ю. Канэ // Полымя. – 1978. – № 7. – С. 248–253.
8. Яскевич, А. Ритмическая организация художественного текста / А. Яскевич. – Минск : Наука и техника, 1991. – 207 с.
9. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / НАНБ, Ін-т літаратуры імя Я. Купалы. – Мінск : Беларуская навука, 2002. – Т. 4. – Кн. 1 : 1966 – 1985. – 928 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова